# *Пачатак вайны (верасень 1939 г.)*

**Асіпюк Анна, Орля:**

Калі ў верасні 1939 года выбухла вайна, мой тата атрымаў павестку ў Бельск. Я з сястрой Кацяй, старэйшай за мяне на тры гады, праводзілі бацьку на гасцінец, што з Локніцы ў Бельск. Калі тата адыходзіў, мы плакалі і махалі рукамі; праз нейкі час ён вярнуўся дадому.

**Багацэвіч Галіна, Орля:**

У верасні 1939 года ў Орлю ўварваліся немцы, усе на матацыклах, і на рынку раздавалі дзецям шакаладкі з каробачак. Збіраліся і гаварылі, што яны не астануцца, а неўзабаве прыйдуць рускія. Сапраўды, праз нейкі час прывалакліся рускія, везлі ўстарэлыя гарматы конскай цягай, быццам пры цары.

Навуку ў школе завяршыла я яшчэ пры санацыі; маючы 13 гадоў скончыла сем класаў. Пасля мама паслала мяне вучыцца на краўчыху, да Фейгі Фукс, арлянскай яўрэйкі. І калі надыходзілі саветы, то мясцовыя людзі цешыліся, прывітальныя брамы стаўлялі, віталі іх. А тая жыдоўка мне кажа так:

— А ты чаго так радуешся?

— Бо то нашы ідут! — адказала я.

— То вашы? — адказала яна мне. — То ідут нашы: віэтэ будэтэ жаты, а мы оно будэм шчытаты!

**Барысюк Наталля, Андрыянкі:**

У 1939 годзе з’явіліся ў нас немцы, але нядоўга былі, а праз нашу вёску адно пераязджалі. У сястры быў маленькі сынок і адзін немец сказаў: То bebuнь maiy!

Калі рускія мелі прыйсці, то ім каля царквы браму паставілі. Прывітанне арганізаваў Міхал Каптэвіч, які калісь на святара вучыўся, але вучобы не завяршыў. Народу зышлося многа, людзі цікавыя былі. Але былі і такія, што не пайшлі, бо баяліся, што там могуць пабіць.

**Жак Ян, Каўпакі:**
У 1939 годзе я быў мабілізаваны на вайну, у Саколку, у санітарны табар. Ваявалі мы з немцам, можна сказаць, голымі рукамі. Польшча не мела зброі, не было ні танкаў, ні самалётаў. Быў на фронце аж да канца вайны, пакуль Польшча скапітулявала. Трапіў я ў палон і немцы загналі нас аж у Ковель. 18 верасня прыляцелі савецкія самалёты, высыпалі афішкі на польскай і рускай мовах, каб мы не давалі адбою, бо яны ідуць нас вызваляць. Палякі загарачыліся: „Не дамы се кацапом!” Але нас беларусаў было больш і мы сказалі: „Не”. І вечарам паручнік склікаў сход і сказаў: „Кто хцэ воёваць, то ў ноцы рушымы ў керунку на Румуніе і бэндзем ешчэ воёваць, а кто не хцэ, то гдзе хцэ”. То мы, беларусы, кажам: „А чаго ж мы пойдзем далей?” І мы асталіся ў Ковелі. А некаторыя польскія часці адбіваліся і нанеслі рускім вайскам страты. То рускія сказалі: „Як так, то не туды дарога”, і пачалі нас, якія ўжо вярталіся дадому, усіх лапаць. У вагоны і на востраў Селігер, у Асташкаў, у Калінінскую вобласць. На тым востраве пры цары былі манастыры, там манахі жылі. Тартак там быў. Памерці то там нельга было, бо давалі нам паўкіля хлеба, літр супу рыбнага; рыбы не. Прабылі мы там амаль да снежня. Праводзілі перапіс. Ну, мы, беларусы, то зналі крыху лепей па-руску і тлумачылі, бо былі такія палякі, што нічога па-руску не разумелі. То я пытаў іх па-польску і тлумачыў на рускую. Ну, рускай то я таксама добра не ўмеў, але якась дагаворваліся. Нас там было дванаццаць тысяч польскіх вайсковых. Загналі нас у тыя манастыры, а яны былі падчас рэвалюцыі разбіты, то мы выбіралі, дзе хоць дах цэлы, каб не цякло. Прыказалі нам рабіць нары ў тых цэрквах; парабілі тыя нары і на тых нарах качаліся. Апанавалі нас вошы. У снежні нас рассартавалі: хто па гэты бок Буга, то сказалі збірацца, а хто з таго боку, што пад немцам астаўся, то рускія сказалі: „Мы сілы рабочае немцам не дамо, бо нам патрэбна”. Некаторыя афіцэры не маглі перанесці гэтага палону і пачалі ўчыняць самагубствы. Мы мелі з сабою пледы, і яны абвівалі галаву пледам і пачалі тапіцца ў Волзе. Пры мне чатырох афіцэраў утапілася. То пасля саветы паставілі „голубятники” навокал, і на пяцьдзесят метраў да ракі ні кроку! Далі нам пасля катлы, каб мы той свой бруд выварвалі. Пасля нас баржамі завезлі на станцыю ў Асташкаве; таксама, як і прывезлі. Пагрузі-

лі нас у поезд і прывезлі ў Мінск і павялі да вайсковай кухні. Пакармілі нас і завезлі ў Баранавічы, на тэрыторыю былой Польшчы, далі па паўбулкі хлеба і сказалі: „Прывезлі вас у Польшчу і цяпер ступайце, куды хаціце”. Што сталася з тымі, што асталіся, што былі з-за Буга, не знаю; кажуць, што іх расстралялі. Пры мне ў Асташкаве нікога не расстралялі. З Баранавіч прыехаў я поездам у Жэдню, а з Жэдні пяшком у Каўпакі прыйшоў. Мяне прывіталі як пакойніка, бо ніхто не ведаў, што я жыву. Клічуць мяне ў хату, а я кажу што дахаты не пайду — дайце мне адзенне, я апрануся, а гэта, вайсковае, хай ляжыць на падворку.

**Казлоўскі Антон, Калодна:**

У школу пайшоў я ў сем гадоў. Мама прасіла, каб адтэрмінавалі, бо слабы, але настаўніца прыняла. У 1939 годзе перайшоў я ў другі клас.

Летам людзі сталі гаварыць пра вайну. У гміну паклікалі шэсць чалавек у польскае войска, але не бралі палітпадазроных і былых рускіх салдат.

У верасні дзеці ў школу ўжо не пайшлі. У пачатковых днях месяца праляцелі з поўдня на поўнач самалёты — відаць вярталіся скінуўшы груз. Нешта затраскатала, мабыць стралялі.

У другой дэкадзе верасня ў нашу вёску з’явіўся атрад польскай кавалерыі — з Юроўцаў, дзе меў сутычку з немцамі. Пераначавалі ў нашай вёсцы, нас нават кавай пачаставалі. Раніцай мы ўжо гулялі на вуліцы. Выйшаў іх камандзір, пачуў гул, загадаў схавацца ад налёту. Неўзабаве кавалерысты паскакалі далей.

**Касцюк Уладзімір, Козлікі:**

У 1939 годзе вучыцца ўжо нават не пачыналі, а настаўніца выехала. У верасні з’явіліся немцы, на роварах прыехалі. Вельмі добрыя былі, давалі дзецям шакаладкі і цукеркі; мо іх у польскіх крамах награбілі і так раздавалі. Былі чыстыя, акуратныя, пабылі некалькі дзён.

**Кірылюк Аляксандр, Дубічы-Царкоўныя:**

У 1939 годзе мелі прыйсці да нас саветы і мясцовыя камуністы нарыхтавалі ім прывітальную браму з палымяным лозунгам і партрэтам Сталіна. Але неяк так дзіўна атрымалася, што заміж саветаў у Дубічы ўкрочыла механізаваная нямецкая ваенная часць. І яшчэ больш дзіўна, што нямецкія чыны з танкетак, танкаў і матацыклаў аддавалі перад брамай з партрэтам Сталіна ваенную чэсць. Гэтая часць начавала ў Дубічах-Царкоўных і ўначы вартаўнікі стралялі ўгару ракеты і адна з іх упала на Турках (частка Дубіч ад Тафілаўцаў) на страху хлява, ус-

пыхнуў пажар, а паколькі ўсё было пад саломай, згарэла палова вёскі. Людзі пасля шапталі, што гэта быў „падарунак” Дубічам за тую прывітальную браму. А як было ў сапраўднасці, адзін Бог ведае.

**Кондэль Аляксандр, Нурэц (Нурэцкая гміна):**

Скончыў я школу ў 1939 годзе. І вайна. Забіралі людзям коней, вазы. Даручылі мне чужых коней і новы воз, каб у Брэст завесці. Найбольш коней рэквізавалі ў Сасінах і Сабятыне, бо там добрая зямля была, людзі багацейшыя былі і мелі добрых коней. Завёў я коней з возам у Брэст, а сам пяшком вярнуўся дадому; адны лейцы прыхаваў і прынёс з сабою.

Калі вярнуўся, былі яшчэ тут палякі, але неўзабаве з’явіліся і немцы. Яны тут былі поезд збамбілі і многа салдатаў і коней пабілі. Да людзей тады немцы не чапляліся.

**Лук’янюк Мікалай, Бялкі:**

Пачатак вайны памятаю: нашы жаўнеры на конях, уланы, ехалі на ўсход, затрымаліся ў нашай вёсцы, і адзін улан злез з каня і зайшоў у наш агародчык ды сарваў дзве грушы. Маці выйшла папрасіць, каб ён іх не браў, бо гэта ў нас першыя грушы-фунтаўкі і мы іх яшчэ не каштавалі. Салдат вярнуў адну грушу маёй маці, а другую парэзаў нажом на кавалачкі і падзяліўся з калегамі. Сказаў тады той жаўнер: „Не бойся, маці, мы сюды яшчэ вернемся”. Але многім гэта не ўдалося — загінулі ў савецкіх казематах... Пасля 17 верасня я не бачыў, каб уцякалі яны на захад.

Памятаю, як у нядзелю раніцай каля будынка школы з дзвюх доўгіх жардзін зрабілі браму, вітаючы Чырвоную Армію ды раздаючы „іконы” са школы. Адну ікону аддалі жыхару Іванак, які якраз праязджаў цераз нашу вёску.

**Нядзельская Зінаідая, Орля:**

1 верасня 1939 г. успыхнула вайна. Немцы з’явіліся ў Орлі праз 4-5 дзён. Спыніліся яны ў рынку і там прыводзілі сябе ў парадак — мыліся, чысцілі абмундзіраванне. Немцы былі ў нас два дні і пайшлі далей. Два тыдні не было нікога, а потым з’явіліся саветы. Прыйшлі яны неспадзявана і ніхто іх у нас не сустракаў і не будаваў прывітальных брамаў.

**Панасюк Ніна, Старое Беразова:**

Так мы ціха жылі, аж пайшла раптам пагалоска: немец на Польшчу напаў! Нашу сям'ю ахапіў жах, таму што бацька наш прымаў непасрэдны ўдзел у першай сусветнай вайне. Ваяваў ён на фінскім фронце і цану вайны ведаў. У 1939 годзе прыйшлі немцы, але неўзабаве нас пакінулі і, як тады гаварылі, занялі нас саветы.

**Паплаўскі Уладзіслаў, Канцавізна:**

У 1939 годзе прыйшлі немцы. У Суражы на мосце біліся, а ў нас не; там іх многа ілягло. І ў нашу вёску немцы заходзілі: усе мы хаваліся, толькі старыя аставаліся дома. Немцы доўга не былі; неўзабаве прыйшла руская разведка. У нас іх ніхто не сустракаў і нікога ад нас не вывезлі. Да работы не прымушалі і не бралі, напр. у міліцыю. Гміна, так як і пры санацыі, у Рынках была; у Суражы быў адно магістрат.

**Петышук Мікалай, Хлевішчы:**

Была дзесьці палова верасня 1939 года. Быў сонечны цёплы дзень, а мы, малечы, татавы наследнікі, а было нас пяць хлопчыкаў і адна дзяўчынка, пад камандай найстарэйшага насілі дровы, а старэйшы брат складваў іх роўненька пры сцяне хлява. Раптам даляцела да нас нейкая размова. Брат выглянуў, і сказаў: „Польскае войска прыехала". Нейкі афіцэр распытваў нашага бацьку. Тата адказваў, паказваючы рукой у бок Брэста, называючы мясцовасці, якія па дарозе ў той бок. Афіцэр запісаў штосьці алоўкам. А мы, малыя, глядзелі то на яго шапку-рагатыўку, то на пояс, дзе была кабура пісталета. Гэта была для нас нагода пахваліцца калегам, што ўбачылі.

Афіцэр змераў нас вачыма і запытаўся: „A czyjeï to bkdzie wojsko?" Бацька адказаў: „Напэўна, польскае". Афіцэр падзякаваў, аддаў салют і пайшоў да сваіх. Яны хутка паехалі ўзлескам, Таяўкамі, пасля Буркамі, урочышчам Пограб, дзе былі сенажаці, а адтуль быў добры від на вёску Хлевішчы і дарогу з Хлевішч у вёску Тэрэхі. На той дарозе стаяла нямецкая танкетка. Пачалася страляніна. Немцы пакінулі танкетку, забралі кулямёт, хацелі дабрацца ў лес. Там было польскае войска. Немцы залезлі ў старыя зарослыя акопы, з першай сусветнай вайны.

Страляніна не была працяглай. Прыйшоў да нас сусед Васіль і сказаў, што на Пограбе ляжаць забітыя немцы. Ён там быў і бачыў, і польскі жаўнер сказаў яму, што на ўскраіне Таявак, каля хутара Сцяпана Зінчука, ляжыць двух немцаў. Васіль з бацькам пайшлі туды, а мы, малыя, за імі. Бацька стаў крычаць, а Васіль кажа, што там няма нічога страшнага: „Няхай ідуць!" Салдаты ляжалі тварам уверх, у чорных мундзірах, а наўкол іх сабраўся тлум вяскоўцаў. Кавалерка шука-

ла ружжа, ды Васіль сказаў, што забрала яго польскае войска. Падняў круглую банку і даў нам, кажучы, што гэта процівагаз. „Зрабіце, хлопцы, з гэтага рагаткі, страляйце варон, а банка будзе ў мяне на карбід”. Бацька пагнаў нас дадому.

На другі дзень мы мелі ўжо свае рагаткі і пугалі з іх варон. Пасля прыйшоў Васіль і паведаміў, што той другі нямецкі салдат быў толькі паранены. Жыхары вёскі Хлевішчы зрабілі яму перавязку. Забралі яго немцы, а мёртвага пахавалі за вёскай, на ўзгорку, пры дарозе на Высокае.

**Плева Сцяпан, Істок:**

Як немцы ў 1939 годзе ўвайшлі ў Польшчу, то затрымаліся ў Дубічах-Царкоўных. З людзьмі яны ветліва абыходзіліся. Нашы хлопцы заехалі ў Дубічы на веласіпедах, то іх шакаладам частавалі. І людзі пра немцаў не хваляваліся, бо ў час першай сусветнай вайны яны паводзілі сябе карэктна.

Гаварылі, што бацька Алёшы Яравога з Карыціск, які ўмеў добра па-нямецку гаварыць, сеў на харошага жарабца і паехаў у Дубічы. Тыя немцы каня хваляць, а ён кажа ім, што за такіх тры кані ён купіў матацыкл. І пытае, за колькі немцы аддалі б. А яны адказалі, што за аднаго.

**Пташынскі Мікалай, Міхнаўка:**

У войску служыў я ў Гродне. А ў 1939 годзе змабілізавалі мяне ў Беласток, а адтуль перамясцілі ў Чаромху. Там станцыю бамбілі. Быў загад не выходзіць з вагонаў. Усе паўцякалі, а я адзін у вагоне астаўся, абклаўся рукзакамі — думаю, ад асколкаў усё ж такі прыкрыюць — і так ляжаў. Пасля бамбёжкі правяраюць вагон. І я там — адзіны, які выканаў загад; і мне за тое капрала далі. Але было гэта ўжо ў Брэсце, куды нас далей перабазіравалі; там мяне і камандзірам каманды назначылі.

У Брэсце многа войска сабралася. Перад ім выступіў французскі афіцэр і сказаў, што Францыя прыступіла да вайны. Пасля мы з Брэста пехатою ішлі, ішлі і ў лес зайшлі. Паселі і тры дні ні піць, ні есці не было. На трэці дзень у чыгунах пакрышаную з лупінамі бульбу нам прывезлі і мы яе расхапілі і з’елі.

Я суседу кажу: „Пеўні спяваюць, рана, ідзем туды”. Ідзем, а там на паляне леснічоўка. Хлеба просім — няма. Мёд ёсць. Наклала нам гаспадыня ў мэнажкі мёду, мы наеліся, вадою папілі і ён кажа: „Спяваць хочацца!” Вярнуліся ў часць. Пайшлі далей, зайшлі ў маёнтак, пасілкаваліся, і пехатою ажу Белую-Падляшскую зайшлі. А адтуль скіравалі нас у Румынію. Праз Уладаву пад Ковель зайшлі. Там камандзір сказаў, што семнаццатага ўвайшлі саветы

і што мы можам „na wiasn№ rkkk” ісці, бо „nie ma co”. І я свой штуцэр „Flower”, які мне яшчэ ў Беластоку без патронаў далі, на дрэва павесіў.

Былі такія, што арганізавалі войска „biж czerwon№ szmatk”. І яны калі спаткалі саветаў, сталі страляць па іх. То іх саветы на Сібір павезлі; і ад нас адзін туды папаў і вярнуўся пасля пятнацацці гадоў. І на Валыні разня страшэнная стала: украінцы нападалі на палякаў, забіралі ружжо, мундзіры... Адны добрыя, а другія яшчэ лепшыя...

Я тое пабачыў і кажу калегам: „Ідзем дахаты!”

— А як дахаты? — пытаюць.

Я кажу, што ў войску ў Гродне вучыўся і выведу, лесам завяду. І павёў.

Падышлі да Прыпяці. Вада чорная, поўная рэчка. Пераправіцца на лодцы хочам, але лодка да пня прычэплена. Той пень вырвалі, але ён лодку на дно цягне. То мы на другі канец лодкі паселі і так пераплылі.

Каля Каралеўскага канала поезд на Пінск уцякаў. А адтуль саветы, то поезд назад. І там такая стральба паўстала, што мы толькі рана пайшлі далей.

У Пружанах саветаў спатыкаем, мы рукамі да іх махаем:

— Здравствуйте!

— Рускія? — пытаюць нас.

— Рускія.

— Адваявалі?

— Адваявалі.

Яны ў свой бок пайшлі, а мы ў свой. Заходзілі ў вёскі, прасілі есці. Мы худыя былі, то нас шкадавалі і кармілі.

Вярнуліся. Каля чыгуначнай станцыі сустракаю аднаго, а ён кажа, каб у Ляўкова зайсці, бо там жонка на сходзе. Я зайшоў і ўжо разам дадому вярнуліся.

Пасля саветы паляванне нам арганізавалі ў Белавежы, я там нават аленя забіў. А камандзір то яшчэ і фундаваў нам.

У саветаў найгоршае было тое: насыпай і вязі! І сырое збожжа ў Свіслач вазілі, а яно ўсё спарылася і згніло.

**Пуц Сцяпан, Барысаўка:**

У 1939 годзе мне было 14 гадоў. У верасні прыйшлі да нас саветы. Ехалі на конях, а старэйшая моладзь вітала іх:

— Здравствуйте, товарищ Сталин, вождь нашей армии!

Саветы салютавалі, а нашы хлопцы крычалі: „Ура!”

**Русь Міхал, Тапілец:**

У 1939 годзе з’явіліся немцы. Мой старшы брат з трыма калегамі паехалі іх пабачыць. Немцы іх захапілі, загналі на пляц у Харошчу

і загадалі біць прыгнаных кароў. Калі ўбачылі, што брат умее абыходзіцца з мясам, яго пакінулі, а тых траіх выпусцілі. Але калегі зрабілі ноччу падкоп і брат уцёк; немцы не шукалі ўжо яго.

Калі бамбілі Лапы, у нас працавала двух хворых са шпіталя ў Харошчы: яны галовы кошыкамі панакрывалі.

— Чаму так робіце? — спыталі мы.

— Каб асколкі нас не пабілі.

**Сакалоўскі Уладзімір, Сухінічы:**

У верасні 1939 года немцы дайшлі да Саколкі, паказаліся там і адступілі. Прыйшлі саветы. У Сухінічах іх ніхто не вітаў. Мо толькі там, дзе да вайны былі падпольнікі; гаварылі, што ў Шудзялаве іх віталі. А ў нас падпольнікаў не было, бо палова вёскі польская, а палова руская і адны другіх баяліся. Упершыню ўбачылі іх у нас, як самаход з двума байцамі заехаў. А так, то яны ішлі праз Саколку і Крынкі, дзе дарогі былі. Я з хлопцамі ў Саколку паляцеў паўглядацца; многа тады войска з Гродна праз Саколку ў Беласток ехала.

**Свентахоўскі Сіман, Вялікія Тыневічы:**

Другі раз мабілізавалі мяне 27 жніўня 1939 года. Як заехаў я ў Слонім, то ўжо там войска мала было, бо паехала на фронт. Уначы я там пільнаваў будынкі ад пажару, а ўдзень працаваў грузчыкам. Грузіў вагоны, якія ішлі на фронт. Толькі мяне на фронт не пасылалі, не ведаю чаму, можа таму, што праваслаўны? Але як прыязджалі хлопцы з фронту, то пыталіся мы, як там.

— А што тут гаварыць, шаржы няма, войска не ведае, што рабіць. Балаган.

Калі стала вядома, што саветы выступілі, то камандзір распусціў нашу часць. Аддалі нам цывільную вопратку і дзесьці за тыдзень прыйшоў я дадому. На другі ці трэці дзень, едучы на ровары ў Бельск, бачыў каля шашы надпісы: „Не стрелять! Здесь германские войска!" А ў Катлах у шчыце клуні вісеў вялікі, бы ходнік, чырвоны сцяг з белым кругам усярэдзіне, на якім намаляваны быў паламаны крыж. Іхняя свастыка. Але немцаў то я ўжо не бачыў.

**Свіцкі Яўген, Ячна:**

У 1939 годзе была мабілізацыя, з Ячна 10 чалавек узялі. Пайшлі яны на поезд у Гарасімавічы, за імі бабы з дзецьмі ішлі, плач быў. Каля ставу, дзе пазней пахавалі Кунавіна, нямецкі самалёт восем бомбаў кі-

нуў у поезд. Машыніст спыніўся і бомбы збочылі. Самалёт паляцеў на Гродна, а поезд паехаў далей.

Некаторыя са змабілізаваных ужо на трэці дзень вярнуліся, а некаторых аж пад Львоў завезлі; адзін прапаў, а апошнія вярнуліся. І рускія ў палон бралі; на Салаўкі сорак тысяч забралі, м.інш. майго цесця. Калі яго адпусцілі дахаты і ў Гарасімавічах вылез, то не даў рады дайсці дадому. Яшчэ польскае войска ўкраінцы нападалі, білі і душылі. Але нашых ратавала тое, што па-нашаму ўмелі гаварыць. Пацер па-руску згаварылі і адпускалі:

— Нэ рущ, то наш чоловік, — гаварылі.

**Секаноўскі Барыс, Барысаўка:**

У 1939 годзе, калі выбухла вайна, немцы дайшлі да Гарадзіска, там іхнія дзве гарматы ўстраглі, то яны іх бельгійскімі коньмі выцягалі; палякі адступілі перад імі; адзін атрад на Ліпіны, а другі на Масева. Немцы з Гарадзіска далей не пайшлі, вярнуліся, бо задалёка зайшлі за дагавораную з саветамі граніцу. Пашваргіталі яны, запраглі коней і паехалі на Ласінку назад.

Саветаў ніхто не сустракаў; да вайны ў Барысаўцы не было камуністычнай ячэйкі. Людзі бульбу капалі, аж бачаць: якоесь войска едзе, самаход за самаходам, пяхота, пасля артылерыя з коннай цягай.

**Стэльмашук Пятро, Вулька-Тэрахоўская:**

Як у 1939 годзе прыйшлі саветы, нехта на скрыжаванні дарог збудаваў браму для прывітання салдат. Знайшоўся сышчык, які аб гэтым паведаміў немцам у Высокім. Пакуль гэтыя прыехалі, у вёску заехаў патруль польскіх коннікаў. Паколькі было спакойна, вайскоўцы ад'ехалі. Пад вечар прыехалі немцы, затым і атрад польскага войска. Пачалася перастрэлка. Немцаў пастралялі палякі. Солтыс казаў іх пахаваць. Як пазней выявілася, шмат польскіх вайскоўцаў хлынула ў гэты час з-пад Брэста ў напрамку Нурца цераз навакольныя вёскі. Пасля вайны пабітых немцаў эксгумавалі.

**Філіманюк Васіль, Мора:**

Ваенную службу праходзіў я ў 4 батарэі 9 палка цяжкай артылерыі ў Уладаве. Быў верхавым, апекаваўся двума канямі з васьміконнай запрэжкі гармат-гаўбіц (125 і 155 мм). Вярнуўшыся з войска паспеў я толькі ажаніцца з Нінай Швед, калі ўспыхнула вайна. Маючы на руках мабілізацыйную карту неадкладна ставіўся я на месца ваеннай службы ў Уладаву і быў прызначаны да 93 дывізіёна цяжкай артыле-

рыі, які загрузіўся на цягнік і адправіўся праз Варшаву ў Легіянова. Абкапаўшыся ў Зэгжы, скіравалі мы агонь на Модлін, які ўжо занялі немцы. Неўзабаве аднак вымушаны былі пакінуць свае пазіцыі і накіраваліся на абарону Варшавы. Размясціліся ў Лазенках ля помніка Шапену, побач з Бельведарам.

8 верасня першыя нямецкія бранячасці дайшлі да граніц горада. Немцы спадзяваліся, што лёгка ўвойдуць у Варшаву. Аднак на вуліцы Апачэўскай атака была адбіта. 9 верасня немцы арганізавалі новую атаку на Ахоце і на Волі, аднак і гэтая атака нямецкай 4 бранявой дывізіі была адкінута. У наступленні нямецкіх войск прымала ўдзел каля 250 танкаў, з якіх каля 60 былі намі знішчаны і столькі ж пашкоджаны. Польскія абаронныя сілы ў той час былі даволі скромныя. Складаліся яны з 7 страявых батальёнаў пяхоты, трох маршавых і сямі імправізаваных батальёнаў, 52 гармат, 12 гаўбіц (у абслузе адной з іх быў я) і 33 лёгкіх танкаў. У апошнія дні абароны сталіцы было ў горадзе 3 тысячы афіцэраў і звыш 82 тысяч радавых салдат. Не хапала аднак боепрыпасаў, яды, перавязачных матэрыялаў, лякарстваў. Налёты гітлераўскіх самалётаў нішчылі горад, усюды ўспыхвалі пажары, штораз больш было забітых і параненых, так сярод салдат, як і цывільнага насельніцтва, якое надзвычай актыўна ўключалася ў абарону сталіцы. Абарона Варшавы закончылася паражэннем. Паказала яна аднак аграмадныя маральныя вартасці яе абаронцаў і з’яўляецца доказам таго, што можна паспяхова змагацца нават з так арганізаваным тэхнічна ворагам. Я атрымаў пісьмовую падзяку ад свайго камандзіра за ахвярнае змаганне.

28 верасня быў падпісаны капітуляцыйны дагавор, паводле якога польскія афіцэры мелі пайсці ў ганаровы палон, а радавыя салдаты з абароны Варшавы мелі быць звольнены дамоў. Немцы ўвайшлі ў Варшаву 30 верасня і 1 кастрычніка 1939 года.

На трэці дзень пасля капітуляцыі абаронцы Варшавы склалі ружжо ў Варшаўскай цытадэлі.

Я папаў у нямецкі палон. Два тыдні знаходзіўся я ў Гуры Кальварыі, адкуль абаронцаў Варшавы адправілі ў Мінск-Мазавецкі. Палонных падзялілі на тэрытарыяльныя зоны. Тых палонных, якія паходзілі з тэрыторыі аб’яднанай з Савецкай Беларуссю — па дамоўленасці з савецкімі ваеннымі ўладамі — перадалі СССР. Завезлі нас у Брэст, адкуль я вярнуўся дамоў.

**Харытанюк Мікалай, Паўлы:**

Немцы? Я іх памятаю, як у трыццаць дзевятым напалі на Польшчу. Ехалі на роварах і на конях. Выглядалі прыемна, былі гжэчныя: што на вёсцы бралі — за ўсё плацілі грашыма, за хлеб, малако, яйкі.

Мне ў тым памятным верасні было адзінаццаць гадоў. У трыццаць восьмым я пайшоў у школу ў Паўлах. Раней не мог, бо мусіў пасвіць кароў. Затое за першы год скончыў два класы пачатковай школы.

Першыя немцы ўвайшлі да нас у верасні, а рускія прыйшлі дзесьці ў кастрычніку, і нейкі час не было ўлады. Трэба прызнаць, што ў трыццаць дзевятым, нават калі немцы адыходзілі перад уваходам рускіх, яны былі такія самыя, як на пачатку. Шкоды людзям не рабілі.

Мо месяц часу была ў нас цішыня. Па радыё (адзін чалавек у нас меў — Ануфрыюк Міхал) людзі даведаліся, што маюць увайсці рускія. Нашы людзі іх чакалі. І брамы, а як жа, на дарогах парабілі: і на дарозе з Давідавіч, і з Цялушак. Упрыгожылі іх ялінай, геаргінямі.

**Хмялеўскі Ян, Паўднёвы Востраў:**

У 1939 годзе, калі пачалася нямецка-польская вайна, з нашай вёскі мабілізавалі коней у Крынкі, Лешчаную і Кудроўшчыну. Коней ацэньваў афіцэр і калі слабыя былі, то не бралі. А за забраных заплацілі новымі грашыма; заплацілі таксама тым, што тых коней загналі.

Немцы да нашай вёскі не даехалі. Даехалі ў Крынкі маторамі, але зараз адступілі.

Саветаў віталі ў Крынках, жыды і нашыя кветкі ім кідалі. Калі савецкая калона праходзіла праз нашу вёску на захад, то адзін наш вясковец іх вітаў; было гэта тады, калі бульбу выбіралі.

Савецкае войска спынілася на некалькі дзён каля нашай вёскі. На адну стадолу палатно начапілі і фільмы паказвалі — уся вёска хадзіла глядзець. Пасля тое войска адышло.

**Хомчык Юльян, Сакалда:**

У 1939 годзе як пайшоў у армію, з першай мабілізацыі, 28 жніўня, у 3 полк цяжкай артылерыі, то вяртаўся пешшу аж з Уладзіміра. Немцам трапіў у рукі, рускім. У парваным адзенні, у лыжных ботах, дзіравым плашчы. Ішоў на Крынкі. Саветам у рукі трапіў ужо на Падляшшы. Цудам нейкі маёр высвабадзіў, шапнуў палонным на вуліцы: „Уцякайце, я страляць не буду!”